УДК 947.6.«1917»

**І. М. Рыжанкоў**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# БАРАЦЬБА ЎРАДАВЫХ І ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ З ТАЕМНЫМ ПРОДАЖАМ ХЛЕБНЫХ ПРАДУКТАЎ У БЕЛАРУСІ (ЛЮТЫ – КАСТРЫЧНІК 1917 Г.)

У артыкуле асвятляецца барацьба ўрадавых і грамадска-палітычных арганізацый з таемным продажам хлебных прадуктаў і вінакурэннем. Аўтар адзначае, што з пачаткам Лютаўскай рэвалюцыі наваствoранаму Часоваму ўраду давялося вырашаць наспелыя пытанні эканомікі: дарагоўля, дэфіцыт прадуктаў харчавання, забеспячэнне шматмільённай арміі і інш. На валасных сходах, маніфестацыях, малебнах грамадскасць беларускіх губерняў, як і ў цэлым у Расіі, выказала поўную падтрымку ўрадавай праграме: вайна да пераможнага канца, рэалізацыя хлебнай манаполіі, будаўніцтва дэмакратычнай дзяржавы і паскораны рух да аграрнай рэформы. Пад восень 1917 г. адбываецца паглыбленне эканамічнага крызісу, пашыраецца чорны рынак продажу хлеба, нарастае дэфіцыт харчовых прадуктаў, зніжаецца аўтарытэт урадавых і сілавых структур. Вяскоўцы ўхіляюцца ад продажу хлебнай прадукцыі дзяржаве па «цвердых цэнах» на карысць «чорнага рынку».

**Ключавыя словы:** рэвалюцыя, вінакурэнне, хлебная манаполія.

**Для цытавання:** Рыжанкоў І. М. Барацьба ўрадавых і грамадска-палітычных арганізацый з таемным продажам хлебных прадуктаў у Беларусі (люты – кастрычнік 1917 г.) // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2022. № 1 (257). С. 38–40.

**I. M. Ryzhankou**
Belarusian State Technological University

# THE STRUGGLE OF GOVERNMENTAL AND SOCIO-POLITICAL ORGANIZATIONS WITH THE SECRET SALE OF BREAD PRODUCTS IN BELARUS (FEBRUARY – OCTOBER 1917)

The article highlights the struggle of government and socio-political organizations with the secret sale of bread products and distilling. The author notes that with the beginning of the February Revolution, the newly created Provisional Government had to solve urgent economic issues: high cost, shortage of food, provision of a multi-million army, etc. At volost meetings, demonstrations, and prayer services, the public of the Belarusian provinces, as well as in Russia as a whole, expressed full support for the government program: war to the bitter end, the implementation of the grain monopoly, the construction of a democratic state and accelerated movement towards agrarian reform. By the autumn of 1917, the economic crisis was deepening, the black market for bread sales was expanding, food shortages were increasing, and the authority of government and law enforcement agencies was declining. The villagers shy away from selling grain products to the state at “fixed prices” in favor of the “black market”.

**Key words:** revolution, winemaking, grain monopoly.

**For citation:** Ryzhankou I. M. The struggle of governmental and socio-political organizations with the secret sale of bread products in Belarus (February – October 1917). *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2022, no. 1 (257), pp. 38–40 (In Belarusian).

**Уводзіны.** З пачаткам Лютаўскай рэвалюцыі наваствoранаму Часоваму ўраду давялося вырашаць наспелыя пытанні гаспадаркі: дарагоўля, дэфіцыт прадуктаў харчавання, забеспечэнне шматмільённай арміі і інш. Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця не прадугледжвала лібералізацыю эканомікі. Умовы ваеннага часу і поспех дэмакратыі патрабавалі накіравання ўсяго патэнцыялу краіны да ўзмацнення арміі. Забеспячэнне фронту боепрыпасамі, абмундзіраваннем, харчаваннем стала цэнтральнай урадавай задачай 1917 г.

**Асноўная частка.** У сакавіку – красавіку 1917 г. на валасных сходах, маніфестацыях, малебнах грамадскасць Расіі выказала поўную падтрымку ўрадавай праграме: вайна да пераможнага канца, рэалізацыя хлебнай манаполіі, будаўніцтва дэмакратычнай дзяржавы і паскораны рух да аграрнай рэформы. Для вырашэння харчовага крызісу Часовы ўрад прыняў шэраг рашучых мер: законы аб «Хлебнай манаполіі», «Ахове пасеваў», кампанія «Пазыка свабоды» і інш.

Аслабленне ваенна-паліцэйскага рэжыму ў прыфрантавой зоне, дэмакратызацыя палітычнага жыцця прывялі да павелічэння таемнага вінакурэння. Старыя паліцэйскія структуры былі распушчаны, а міліцыя знаходзілася на этапе

фарміравання. Таму ўжо ў сакавіку 1917 г. Віцебскі губернскі камісар М. Л. Карташоў паведамляў, што «амаль ва ўсіх паветах губерні ў значных памерах ладзіцца вытворчасць тайнага вінакурэння, варыцца піва, якое выклікае буйныя прыпадкі» [1]. Асноўнымі пакупнікамі гарэлкі з'яўляліся мясцовыя жыхары, франтавікі ў акопах і дэзерціры, якія хаваліся ў лясах. У большых ці меншых памерах падобнае назіралася ў шэрагу іншых беларускіх губерняў.

Неўзабаве 11 красавіка 1917 г. Часовы ўрад узмацняе адказнасць за продаж спіртазмяшчаючых напояў і ўводзіць турэмнае пакаранне ад 2 да 12 месяцаў.

У той самы час пытанне барацьбы з вінакурэннем не стала галоўным у парадку дня губернскіх, павятовых з'ездаў падчас выбараў камісарыятаў, выканаўчых камітэтаў Саветаў дэпутатаў. Галоўным чынам яно ўзнімалася на мясцовым узроўні – валасных сходах – і перадавалася ў кампетэнцыю наваствoранай міліцыі.

Так, «Витебский листок» ад 5 чэрвеня паведамляў, што агульны сход Веляшкоўскага валаснога камітэта вырашыў «асобам, выяўленным у тайным вінакурэнні, не выдаваць талонаў на атрыманне жыта і харчаванне». Гэтак жа ад 24 чэрвеня пастанова Вымнянскага валаснога схода: «…асоб, якія займаліся вытворчасцю і гандлем самагонкай, запісвалі на чорную дошку і пазбаўлялі права голасу і ўдзелу ў грамадскіх справах, а таксама займаць грамадскія пасады. Шэраг асоб заўважных у вырабе і продажу самагонкі аштрафаваны на 1500 руб.». На старонках «Крестьянской газеты» ад 21 чэрвеня 1917 г. ўзгадавалася пастанова Мільчанскага валаснога выканаўчага камітэта – «заслухаўшы тлумачэнні памочніка надзірацеля Мінскага акцызнага ўпраўлення Дуброўскага аб шкодзе п'янства і тайнага вінакурэння пастанавіла: перапыніць тайнае вінакурэнне і продаж гарэлкі, для чаго даручыла валасному, грамадскаму і сельскім выканаўчым камітэтам строга сачыць за вінакурэннем і прыцягваць віноўных да законнай адказнасці».

На пасяджэнні Казьянскага валаснога харчовага камітэта 23 чэрвеня вырашана «вінакуршчыкам перапыніць выдачу ўсіх прадуктаў і прадметаў спажывання». У жніўні мясцовы валасны харчовы камітэт пад старшынствам М. Матвеева пастанавіў сумесна з міліцыяй весці барацьбу з тайным вінакурэннем, а канфіскаваныя хлебныя прадукты прадаваць насельніцтву па цвёрдых цэнах [2].

Вядома, што дзяржаўная «цвёрдая цана» ў 2 руб. 65 кап. за пуд жыта не паспявала за імклівым ростам рыначнага кошту. «Витебский листок» ад 13 чэрвеня сведчыў, што «з пуда жыта вясковец мог выгнаць чвэрць самагонкі і прадаць за 40–60 рублёў».

Наступныя назіранні можна было сустрэць на старонках перыядычных выданняў Магілёўшчыны. Газета «Могилевский вестник» ад 19 ліпеня: «у нас жывецца весела. Амаль у кожнай вёсцы свабодна паляць "самагонку"… Міліцыя таксама ведае, але не перашкаджае, так як простыя міліцыянты – сяляне самі часам удзельнічаюць у курэнні "самагонкі", а ў распіцці – абавязкова… Трэба змагацца з гэтым злом, усімі мерамі: перакананнямі, гутаркамі, чытаннямі і рэпрэсіямі… самай рашучай мерай з'яўляецца строгі кантроль над продажам дрожджаў, якія неабходныя сялянам толькі да Вялікадня і Каляд, і то не больш за чвэрць фунта». Газета «Могилевская жизнь» ад 12 верасня адзначала: «Хлеб збіраецца дрэнна. Плугі замест 3 руб. дайшлі да 60 і даражэй. Даражае хлеб, дайшоў да 12 руб. за пуд жыта. У кожнай вёсцы адкрыты вінакураныя заводы, гарэлку робяць усе, па начах ідзе гандаль хлеба з спекулянтамі. Неабходна ўсталяваць цвёрдыя цэны на ўсе прадукты і прадметы першай неабходнасці. Тады б наша добрае сялянства пайшло насустрач».

У сваю чаргу, Магілёўская харчовая ўправа звярнулася да павятовых і валасных харчовых управ з прапановай выплочваць узнагароду ў памеры 25 руб. асобам, якія выявілі тайнае вінакурэнне. 8 верасня членам Казьянскай валасной харчовага ўправы Клімавым быў затрыманы салдат каля в. Карысці Пётр Данілаў з бачонкам самагоннай гарэлкі, складзены пратакол [3].

З нарастаннем дэфіцыту хлеба ў гарадах і арміі паведамленні аб сур'езных стратах ад вінакурэння часцей сустракаліся на старонках газет. Так, «Витебское слово» ад 4 кастрычніка паведамляла, што «для ўліка лішкаў хлеба, якія маглі бы пайсці на харчаванне насельніцтва з 15 верасня ў нашым (Веліжскім) павеце, прадпрыняты перапіс хлебных запасаў. Адбываецца вялікая пераапрацоўка хлеба ў самагонку, таму што мясцовыя вінакуры, раскіданыя па ўсяму павету, плацяць за пуд па 25–30 рублей. Калі верыць прыкладнаму падліку павятовай харчовай управы, на самагонку ва ўсім павеце штодня перакурываецца да 1000 пудоў колькасць, якая магла бы пракарміць да 30 000 чалавек». Газета «Наше свободное слово» ад 10 кастрычніка ўзгадавала ўрадавыя цыркуляры да павятовых камісараў і міліцыі аб прынятці мер супраць вінакурэння, на якое «трацiцца вялікая колькасць хлеба». Але міліцыя на валасным узроўні не выяўляла актыўнасць.

Невельскі камісар Н. А. Сямеўскі паведамляў Віцебскаму губернскаму камісару, што «асаблівых эксцэсаў не назіраецца. Самагонку гоняць, але міліцыя і драгуны накрываюць самагоншчыкаў, складаюцца пратаколы, судовыя справы не разглядаюцца. Настрой у павеце спакойны. Большасць гатова цярпліва чакаць

Установчага схода. Сяляне да бягучых спраў адносяцца індыферэнтна. Цікавяцца толькі пытаннямі зямлі і вайны, але разбіраюцца кепска. У зямельным пытанні цікавяцца толькі прырэзкай кожнаму з іх зямлі з прылегаючых панскіх і казённых маёнткаў» [4].

7 кастрычніка на пасяджэнні Віцебскага агульнагубернскага з'езда сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў выступіў старшыня Віцебскай губернскай харчовай управы М. В. Кандрацьеў: «Пасля просьбаў у Петраград, Віцебскай губерні абяцалі з Палтаўскай губерні 600 вагонаў у месяц, але хлеб самавольна масамі вывозіцца новымі спекулянтамі – салдатамі. Фронт наогул не забяспечаны ні хлебам, ні фуражом». «Витебское слово» ад 12 кастрычніка паведамляла, што «па полацкаму павету хлеб адпускаецца самагоншчыкам па высокай цане – да 30 руб. за пуд, дзякуючы чаму хоць колькі па нармальнай цане набыць нельга. Па агульнаму меркаванню, вінакурэннем займаюцца дэзерціры, у вялікай колькасці па вёсках павета і перашкаджаюць барацьбе з самагонкай».

У кастрычніку 1917 г. карэспандэнты перыядычных выданняў адзначалі «спекуляцыйны разгул», «эпідэмію нажывы», «ператварэнне Мінскай губерні ў вялікі вінны завод». Так, «Бобруйский курьер» ад 12 кастрычніка паведамляў: «у адным толькі Барысаўскім павеце, выкурваецца сотні тысяч пудоў спірту… Наогул наша губерня ператварылася ў адзіны каласальны вінакурны завод, забяспечваючы гарэлкай – самагонкай фронт… Сяляне не даюць гораду хлеба, а каласальная колькасць пудоў жыта і бульбы ідзе на перагонку спірту, які паўсюдна распрадаецца па высокіх цэнах».

**Заключэнне.** Пад восень 1917 г. вяскоўцы ўхіляюцца ад продажу хлебнай прадукцыі дзяржаве па «цвердых цэнах» на карысць «чорнага рынку». Перабоі з харчовым забеспячэннем, нарастанне таемнага продажу хлеба, продаж алкагольных напояў дрэнна адбіваліся на баяздольнасці армейцаў і не спрыялі патрыятычнаму ўздыму. Урадавыя структуры і наваствораная міліцыя не здолелі ў поўнай меры аказаць эфектыўнае супрацьдзенне.

## Спіс літаратуры

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Фонд 622. Воп. 1. Спр. 2. Л. 253–254.
2. НАРБ. Фонд 624. Воп. 1. Спр. 7. Л. 119–120.
3. НАРБ. Фонд 624. Воп. 1. Спр. 7. Л. 136 адв.
4. НАРБ. Фонд 60. Воп. 242. Спр. 3. Л. 235–236.

## References

1. National Archives of the Republic of Belarus (NARB). Fund 622. I. 2. F. 2. P. 253–254
2. NARB. Fund 624. I. 1. F. 7. P. 119–120.
3. NARB. Fund 624. I. 1. F. 7. P. 119–120.
4. NARB. Fund 60. I. 242. F. 3. P. 235–236.

## Інфармацыя пра аўтара

**Рыжанкоў Ігар Міхайлавіч** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: im@belstu.by

## Information about the author

**Ryzhankou Ihar Mikhaylavich** – PhD (History), Associate Professor, Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: im@belstu.by

*Паступіў 23.03.2022*